**між іншым**

# У Доме Коласа

**Епіскап Пінскі і Лунінецкі Георгій упершыню наведаў Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей народнага песняра ў Мінску.**

Любоў да нацыянальнай спадчыны ў, светлай памяці, уладыкі Сцяфана (25.03.1944—22.04.2022) праяўлялася праз сапраўднае «місіянерства роднай мовы». Сярод шматлікіх спраў пінскага архіерэя было і штогадовае каляднае віншаванне сваякоў класіка беларускай літаратуры і супрацоўнікаў «храма муз».

— Вельмі хочацца захаваць і падтрымаць традыцыю, закладзеную ўладыкам Сцяфанам, — адзначыў яго пераемнік па архіпастырскім служэнні ўладыка Георгій. — На маю думку, «Каляды ў Доме Коласа» — гэта своеасаблівае духоўнае адраджэнне беларускага народа.

Для гасцей з Палесся экскурсію правяла праўнучка Якуба Коласа Васіліна Міцкевіч. Яна і ўнучка народнага песняра Вера Міцкевіч сталі суаўтарамі кнігі «Табою жыў. Табой жыву…» (2022), прысвечанай жонцы Якуба Коласа. Вядома, што Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч і Марыя Дзмітрыеўна Каменская (якіх, услед за Уладыкам Сцяфанам, называем «беларускімі Пятром і Фяўроніяй») вянчаліся ў Пінску, дзе на званіцы Свята-Варварынскага храма ўсталявана мемарыяльная дошка ў гонар гэтай падзеі. Пасля кароткага прадстаўлення новага выдання кніга з аўтографамі нашчадкаў класіка была падорана архіерэю.

З удзячнасцю духавенству Пінскай епархіі за ўвагу да Якуба Коласа Аляўціна Цімафееўна Міцкевіч, удава старэйшага сына класіка, прыгадала, што браты яе бабулі былі свяшчэннікамі, таму Нараджэнне Хрыстова станавілася вялікім сямейным святам з багатым застоллем, дамашнім канцэртам і духоўнымі размовамі.

Жаданым госцем каляднай праграмы неаднаразова быў кіраўнік місіянерскага аддзела Пінскай епархіі протадыякан Андрэй Гарбуноў з Баранавіч. Вось і цяпер у музычнай гасцёўні ён не толькі захапіў гасцей выкананнем вядомых песень, пачынаючы са своеасаблівага нацыянальнага гімна «Мой родны кут», але і чытаннем урыўка «Каляды» з паэмы «Новая зямля» — сёлета адзначаецца 100-годдзе выдання. Літаратурную частку сустрэчы працягнулі вядомыя пісьменнікі Іна Фралова і Сяргей Трахімёнак, творчасць якіх вельмі любяць і цэняць на Палессі.

**Таццяна КАНАПАЦКАЯ**